**“Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі” (2015–2020 гг.)**

Прыкладная навукова-даследчая работа складаецца з шэрагу тэматычных лакальных праектаў па асобных аб’ектах рэгіянальнай гісторыі Беларусі (гісторыя населеных пунктаў, установ навукі, адукацыі, культуры і інш.).

Мэта работы – даследаваць дакументы і матэрыялы па тэмах праектаў і ажыццявіць лічбавае ўзнаўленне як аўтэнтычных крыніц, так і вынікаў іх навуковага асэнсавання. Вынікам з’яўляецца забеспячэнне крыніцазнаўчай базы і ўвядзенне ў шырокі навуковы абарот матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі шляхам падрыхтоўкі электронных выданняў / віртуальных праектаў, папаўнення электроннай бібліятэкі, бібліяграфічных і фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.